ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 6 (1042) ● ЧАЦВЕР, 21 лютага 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.



Мал. А. Майчанава.

## 23 ЛЮТАГА — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ

Увесь наш народ рыхтуецца ўрачыста адзначыць 56-ю гадавіну Узброеных Сіл СССР.

Ва універсітэце гэтай знамянальнай даце прысвячаюцца тэматычныя вечары і экскурсіі, сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і з маладымі воінамі з падшэфных воінскіх часцей. Пра гераічную гісторыю Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту расказваюць факультэцкія і курсавыя насценныя газеты.

### ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

**Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі адной з важнейшых задач была узброеная абарона дзяржавы рабочых і сялян ад злоснага націску знешняй і унутранай контррэвалюцыі. 15 (28) студзеня 1918 года У. І. Ленін падпісаў дэкрэт Савета Народных Камісараў аб арганізацыі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі (РСЧА), 29 студзеня (11 лютага) — Рабоча-Сялянскага Чырвонага Флоту (РСЧФ).**

* * *

**У гонар баявога нараджэння першых палкоў Савецкай Арміі на ўскраіне Пскова ўзвышаецца манумент — 47-метровы гранёны штык.**

* * *

**Гіганцкая арганізацыйная дзейнасць Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада ў ходзе грамадзянскай вайны ўвянчалася стварэннем рэгулярнай, масавай, кадравай Чырвонай Арміі. Да канца 1920 года яе колькасць дасягнула 5500 тысяч чалавек.**

* * *

**1 верасня 1939 года быў прынят «Закон аб усеагульным воінскім абавязку».**

* * *

**У гады Вялікай Айчыннай вайны Камуністычная партыя стаяла на чале народа-змагара. За першыя паўгода вайны ў партыйныя арганізацыі арміі і флоту ўлілося больш як 1100 тысяч камуністаў. Да канца вайны больш трох мільёнаў членаў і кандыдатаў ВКП(б) знаходзілася ў радах арміі і флоту, што складала 60 працэнтаў саставу партыі. Камуністам быў кожны чацвёрты ваеннаслужачы.**

# ДА НОВЫХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ!

**З вялікім энтузіязмам і ўздымам успрыняў універсітэцкі калектыў Зварот ЦК КПСС да партыі, да савецкага народа з заклікам азнаменаваць чацвёрты год пяцігодкі новымі поспехамі ў выкананні рашэнняў XXIV з'езда КПСС.**

**На ўсіх факультэтах, у аддзелах і ў іншых падраздзяленнях БДУ прыняты павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы. Сёння мы расказваем аб галоўных задачах, якія паставілі перад сабой калектывы фізічнага і філалагічнага факультэтаў.**

### З АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ КАЛЕКТЫВУ ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

Пастаянна павышаць ідэйна - тэарэтычны ўзровень прафесарска-выкладчыцкага саставу, інжынерна-тэхнічнага і вучэбна-дапаможнага персаналу:

— актыўна ўдзельнічаць у рабоце філасофскіх семінараў, палітшкол і гурткоў бягучай палітыкі;

— падаць да абароны адну доктарскую і 23 кандыдацкія дысертацыі:

Паляпшаць вучэбна-метадычную работу:

— падрыхтаваць да друку два падручнікі (па атамнай і малекулярнай фізіцы, па вышэйшай матэматыцы і матэматычнай фізіцы), 20 вучэбных дапаможнікаў, 5 манаграфій, 10 навукова-метадычных артыкулаў, зрабіць 25 дакладаў па пытаннях методыкі выкладання ў вышэйшай школе на кафедральных семінарах.

Распрацаваць 35 новых агульных і спецыяльных курсаў.

Паставіць 70 новых лабараторных работ і ўдасканаліць 50.

Падаць на ВДНГ два экспанаты і адзін вучэбна-метадычнага характару.

Увесці да канца 1974 года сістэму аўтаматычнага апытвання студэнтаў у лабараторыі механікі і малекулярнай фізікі.

Павышаць эфектыўнасць навукова-даследчай работы прафесарска - выкладчыцкага саставу, навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў;

— падрыхтаваць да друку 150 навуковых артыкулаў;

— падаць 15 аўтарскіх заявак на вынаходніцтвы.

Уключыць у план укаранення БДУ 4 навукова-даследчыя тэмы.

Выканаць гаспадарча-дагаворных работ на суму не менш 1 млн. рублёў.

Палепшыць навуковую работу студэнтаў:

— прыцягнуць не менш як 100 студэнтаў старэйшых курсаў да выканання гаспадарча-дагаворных работ;

— падрыхтаваць да публікацыі 20 навуковых артыкулаў (у сааўтарстве з супрацоўнікамі);

— падаць на ўсесаюзны конкурс 5 студэнцкіх работ і на рэспубліканскі — 60.

Правесці падрыхтоўчую работу па стварэнню СНДЛ для работы па гаспадарчых дагаворах (кафедра электрафізікі).

Удасканальваць палітыка-выхаваўчую, грамадскую і шэфскую работу.

Працягваць работу ў школах юных фізікаў пры БДУ і ў г. Дзяржынску.

Прачытаць 20 лекцый для старшакласнікаў аб фізічным факультэце БДУ.

Весці далейшую работу сярод супрацоўнікаў па здачы норм новага комплексу ГПА.

### З АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ КАЛЕКТЫВУ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

Палітыка-выхаваўчая работа:

— шырэй практыкаваць лекцыі і палітгутаркі сярод шырокай грамадскасці ў час педагагічнай, дыялекталагічнай фальклорнай практыкі;

— правесці на факультэце «Вечар славянскай дружбы», свята паэзіі, прысвечанае 10-годдзю літаб'яднання «Узлёт» і інш.;

— прачытаць для шырокай грамадскасці не менш як 200 дакладаў па розных пытаннях развіцця мовы і літаратуры, па актуальных праблемах навукі, эканомікі і палітыкі;

— падрыхтаваць 15 гідаў-перакладчыкаў для «Інтурыста» і «Спадарожніка».

**Вучэбна-метадычная работа:**

— падрыхтаваць праграмы па беларускай дзіцячай літаратуры, беларускай дакастрычніцкай літаратуры.

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**





# У БАЯХ ЗАГАРТАВАНЫЯ, ПРАЦАЙ ВЫПРАБАВАНЫЯ



Цікавай была гутарка ветэрана грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў Л. І. Арціменкава і былога воіна В. А. Бародкі са студэнтамі IV курса юрыдычнага факультэта.

Фота **Д. Чаховіча.**

## ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

**За подзвігі на франтах у гады Вялікай Айчыннай вайны ордэнамі і медалямі было ўзнагароджана больш сямі мільёнаў чалавек, 11 603 воіны ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза, з іх каля 74 працэнтаў — камуністы.**

**З сярэдзіны 50-х гадоў савецкія Узброеныя Сілы ўступілі ў новы этап свайго развіцця—этап карэнных пераўтварэнняў ва ўсіх галінах ваеннай справы ў сувязі з укараненнем ракетна-ядзернай зброі.**

**12 кастрычніка 1967 года быў прынят новы «Закон СССР аб усеагульным воінскім абавязку».**

**Рашаючай сілай Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту з'яўляюцца высокакваліфікаваныя кадры каманднага, палітычнага і інжынерна-тэхнічнага саставу. Сярод афіцэраў і генералаў кожны чацвёрты мае вышэйшую ваенную або спецыяльную адукацыю. Больш 65 працэнтаў афіцэраў палкавога звяна—маладзей трыццаці год, да 45 працэнтаў афіцэрскіх пасад у арміі займаюць інжынеры і тэхнікі. Больш 90 працэнтаў нашых генералаў, адміралаў і афіцэраў—члены КПСС. Камуністы і камсамольцы складаюць больш 80 працэнтаў асабовага саставу Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту.**

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

## ДУШОЮ МАЛАДАЯ

ЯНА НАЛЕЖЫЦЬ да ліку тых, каго называюць камсамольцамі 30-х гадоў. Захопленыя пафасам вялікага будаўніцтва новага жыцця, па-даросламу дзелавітыя, яны вынеслі з яго асаблівы рамантычны склад душы, гатоўнасць да самаахвяраванне і ў той жа час дзіўную прагу жыцця. Прыйшла сталасць. Але лаюнацку заўзяты характар і народжаны рэвалюцыяй неўтаймоўна-энергічны парыў засталіся. І па ўсяму жыццёваму шляху яны цвёрда нясуць добрую чалавечую рысу —спяшацца жыць!

Мне здаецца, гэта самае яркае, што характэрна для нашага юбіляра —Еўдакіі Барысаўны Іванюценкі. Гэту рысу яна заўсёды імкнецца перадаць і маладым, дзеліцца без астатку ўсім тым лепшым, што паспела набыць на сваім працоўным шляху. Шлях жа гэты быў нялёгкі.

Яна нарадзілася на Украіне ў беднай сялянскай сям'і. І хто ведае, як склаўся б лёс, калі б не рэвалюцыя. Маці яе ў 30 год засталася ўдавой з чацвярыма дзецьмі на руках. Савецкая ўлада дапамагла ім усім стаць на ногі.

Былі і горкія хвіліны ў жыцці Еўдакіі Барысаўны: у барацьбе за станаўленне Савецкай улады на Украіне загінуў родны дзядзька (ён пражыў усяго 18 год, але так, што яму пастаўлен помнік у Горлаўцы), памерлі двое дзяцей, на франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі тры браты.

Свой першы працоўны мазоль Еўдакія Барысаўна атрымала ў шахце. Тут, у Данбасе, у 1930 годзе і пачалося яе камсамольскае юнацтва. А потым — сакратар пярвічнай камсамольскай арганізацыі, загадчык аддзела работы з піянерамі Алма-Ацінскага гаркома камсамола, інструктар райкома партыі, нарэшце, пагранвойскі, куды пайшла добраахвотна.

Армейскія шляхі-дарогі прывялі яе ў Беларусь. І пасля дэмабілізацыі вось ужо больш 20 год яна працуе нязменным тэхнічным сакратаром парткома універсітэта. Вялікі і шматгадовы вопыт справаводства, глыбокае веданне ўнутрыпартыйных пытанняў дапамагаюць ёй быць рознабакова кампетэнтным чалавекам. І ніхто не здзіўляецца, калі да яе ідуць за парадай, калі яна ў адсутнасць сакратара парткома або намесніка прымае кваліфікаваныя рашэнні, дае даручэнні, запрашае маладых камуністаў на гутаркі. Яе пастаяннае імкненне як мага больш пазнаць, паспець, перадаць другім свой вопыт выклікае павагу. Яе і сёння можна ўбачыць у бібліятэцы за падрыхтоўкай да семінараў партвучобы, у коле грамадскіх абавязкаў і даручэнняў. У гэтым пастаянным руху, пошуку — мэта яе жыцця, яе крэда.

Частка жыцця пройдзена. Пройдзена з гонарам. Пажадаем жа юбіляру, каб і далей яна была гэтак жа патрэбна людзям.

**М. ЦІВА.**



**НА ЗДЫМКУ: самы тыповы момант з працоўнага дня Еўдакіі Барысаўны Іванюценкі.**

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

## ЖЫВЕ ПОБАЧ ЧАЛАВЕК

**Я ўглядаюся ў твар гэтага чалавека і ніяк не магу ўявіць яго воінам. Такая ўжо мірная яго сённяшняя прафесія. Але ж Ягор Андрэевіч Піскуноў прайшоў усю вайну, адчуў на сабе яе страшэнны подых, тры разы быў паранен і не аднойчы глядзеў смерці ў вочы. І не толькі мне, але і гэтым наведвальнікам дэканата фізфака — юнаку і дзяўчыне, для якіх Ягор Андрэевіч падпісвае паперы, таксама цікава было пачуць расказ ветэрана вайны, мужнага абаронцы Радзімы.**

### АГНЁМ ЗАГАРТАВАНЫ

Вайна перапыніла адпачынак. Пад раскаты бамбёжкі вяртаўся Я. А. Піскуноў у сваю часць. «Хутчэй бы трапіць да сваіх, даведацца аб усім дакладна... — адна за адной роіліся думкі, тоячы ў сэрцы надзею,—а можа гэта толькі вучэнні?»

На запытанне, дзе знайсці сваіх, пачуў:

— Адступаюць, хто застаўся жывы. Бярыце пад камандаванне толькі што прыбыўшых афіцэраў.

Загад ёсць загад. І хоць нясцерпна хацелася ўбачыць сваіх рабят, быць побач з імі плячо ў плячо, трэба было рашаць пастаўленую задачу, ісці на злучэнне з дэсантам. Але планы не здзейсніліся. З баямі адступалі да Ваўкавыска. І толькі ля Баранавіч злучыліся з 210-й мотадывізіяй. Тут Ягор Андрэевіч прыкладае ўсе намаганні, каб як мага хутчэй стварыць артылерыйскае падраздзяленне.

Цяпер ужо не адчувалі сябе адарванымі ад усяго фронту. Вызначаная баявая задача, суровая дысцыпліна цэментавалі людзей.

З сумам і болем у сэрцы прыходзілася пакідаць родную зямлю. Вось ужо побач Беразіна. Калі дывізія пачала пераправу цераз мост, Ягор Андрэевіч з батарэяй прыкрываў ад ворагаў падыходы да яго. Самім пераправіцца не ўдалося, мост ужо палаў. Трэба было шукаць выйсце. Звярнулі ў лясок. Праз некаторы час пачулі гул машын. Па шашы рухалася вялікая калона. Думалася, што гэта свае, што не паспелі пераправіцца на той бераг, але, падышоўшы бліжэй, пераканаліся: немцы. Трэба было прымаць бой. І тут савецкія воіны цаной гераічных намаганняў прарвалі варожы заслон. З групай артылерыстаў Я. А. Піскуноў адыходзіць да Гомеля...

Далей на яго ваенным шляху аб'яднаны партызанскі атрад, распараджэнне з Масквы аб назначэнні намеснікам начальніка штаба. А 12 сакавіка 1943 года важная падзея — злучэнне з Чырвонай Арміяй. Ён начальнік штаба артылерыі 415-й дывізіі, удзельнік некалькіх складаных аперацый: Львоўска-Сандамірскай, Вісла-Одэрскай і інш.

Пры наступленні на Кракаў была ўдала праведзена пераправа па лёдзе, за што Я. А. Піскуноў атрымаў падзяку камандавання. Наперадзе—зноў баі: на Одэрскім плацдарме, за што ўзнагароджан ордэнам Чырвонага Сцяга, затым удзельнічае ў вызваленні Прагі.

Закончылася вайна. Але змаганне за жыццё, за мір прадаўжаецца. Ягор Андрэевіч назначан старшым саветнікам за мяжой. Вярнуўшыся ў Мінск, ён навучае студэнтаў ваеннай справе, выхоўвае новае пакаленне абаронцаў міру і шчасця на зямлі.

І цяпер ён не хоча карыстацца заслужаным адпачынкам. Кожны дзень патрэбна маладым фізікам яго дапамога, парада... Але мала хто з іх ведае, якой невычарпальнай сілай волі, мужнасцю валодае гэты сціплы чалавек. Шмат узнагарод у яго: ордэн Айчыннай вайны І ступені, тры ордэны Чырвонай Зоркі. Ды хіба ўсё пералічыш, што прыйшлося перажыць гэтаму чалавеку! Але яго пражытае жыццё стварае наша сённяшняе шчасце, нашу радасць, упэўненасць.

**В. ЛЕШЧАНКА.**



**Былы лётчык-знішчальнік Міхаіл Іванавіч Юзафовіч ужо многа год працуе загадчыкам вытворчых майстэрань універсітэта і сваёй добрасумленнай працай служыць на карысць мірнага жыцця.**

**Кожны экспанат музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пакідае вялікае ўражанне ў гэтых студэнтаў - іншаземцаў з падрыхтоўчага факультэта БДУ.**

Фота **М. Нечыпарэнкі.**



